Отрок, с его гормональной бурей, иррационализмом и аномной моралью, по мнению В. В.Зеньковского, подобен блудному сыну, ушедшему «в страну далече». Нет никаких норм и правил, кроме своих, нет стабильности, трезвости ума. Есть острое переживание одиночества, замкнутость и недоверие. Духовное начало преобладает над эмпирическим, но оно скорее мрачно и пугающе. Взрослым, как отцу в известной притче, остается только терпеливо ждать и молиться, а также помочь отроку обрести желанную самостоятельность и независимость всеми приемлемыми способами.

Юность отличается духовной, интеллектуальной и физической зрелостью. Достигает полноты созревания дар свободы. Но у юности нет жизненного опыта, она нерасчетлива, ей легко пожертвовать всем. В это время велика опасность подмен романтического пафоса на стремление к легкой жизни, истинных ценностей на дешевые удовольствия. Задача взрослых — поддержать высоту устремлений, направить их в более чистое русло [4].

Таким образом, изучение возрастных особенностей развития духовной сферы личности, изложенных в работах В.В. Зеньковского, могут оказать существенную помощь родителям и педагогам в организации духовно-нравственного воспитания детей и учащейся молодежи.


1. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Текст]: [от 13 янв. 2011 г. № 243-3: принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г.: одобрен Советом Республики 22 дек. 2010 г.]. — Минск: РИВШ, 2011. — 351 с.
2. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь: утверждена постановлением Министерства образования Респ. Беларусь 15 июля 2015 г., № 82. [Электронный ресурс] / Национальный образовательный портал. — Режим доступа: http://www.adu.by/wp-content/uploads/2015/umodos/koncept-vospit-detej-i-molodioji.doc. — Дата доступа: 04.12.2018.
3. Зеньковский, В. В. Психология детства / В. В. Зеньковский. — М.: Академия, 1996. — 346 с.
4. Рогозянский, А. Б. Хочу или надо? О свободе и дисциплине при воспитании детей / А. Б. Рогозянский. — М.: Эксмо, 2005. — 272 с.



***Іваненка Мікалай Міхайлавіч***

*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Вілейская гімназія № 2»*


## Сацыяльныя ролі і станаўленне асобы ў сістэме сямейнага выхавання

Бог дае нам дзяцей з надзеяй, што мы вырасцім і выхаваем іх шчаслівымі і годнымі не толькі для часовага зямнога жыцця, але і для вечнасці. Калі мы клапоцімся, каб маленькі чалавек рос праўдзівым і добрым, развіваем у ім правільныя паняцці аб прыгажосці і жыццёвых каштоўнасцях, мы не навязваем яму нічога чужога яго прыродзе. Мы толькі дапамагаем дзіцяці ў сабе самім заўважыць і развіць тыя якасці і рухі душы, якія дапамогуць яму стаць шчаслівым. Праваслаўная вера дае нам для гэтага самыя высокія і ўзнёслыя правілы.

Выхаванне на аснове праваслаўных каштоўнасцей і традыцый фарміруе ядро асобы, яго светапогляд і ўнутраную эстэтыку, станоўча ўплывае на псіхічныя працэсы і на ўсе бакі ўзаемаадносін чалавека з навакольным светам, грунтуе грамадзянскую пазіцыю, патрыятычную, полараллявую і сямейную арыентацыю, дае аснову гуманістычнаму выкарыстанню фізічнага і інтэлектуальнага патэнцыялу.

Па сіле выхаваўчага ўздзеяння ніхто і нішто не можа параўнацца з сям'ёй. Сям'я закладвае з дзяцінства не толькі правілы паводзін, што адпавядае знешнім праявам выхаванасці, але і дае духоўна-маральную аснову, якая дазваляе чалавеку беспамылкова адрозніваць дабро ад зла, любіць дабро і быць гатовым тварыць дабро. Галоўная мэта стварэння сям'і — узаемадапамога ў жыцці дзеля дасягнення вечнасці [3, 18]. Але менавіта сям'я ў нашы дні застаецца самым слабым звяном у ланцужку інстытутаў, якія бяруць на сябе адказнасць за выхаванне. «Сучасная сям'я — узор разрозненасці. Кожны выжывае сам па сабе… Калі хтосьці патрабуе дапамогі, то заўважаюць патрэбу толькі пасля таго, як здарыцца бяда» [9, 225]. На пачатку спешчанае, залашчанае, скіраванае на самыя высокія жыццёвыя мэты і дасягненні дзіця сутыкаецца ў падлеткавым узросце з першымі жыццёвымі цяжкасцямі і, не знаходзячы адказаў на элементарныя пытанні, заўважае нервовую расчараванасць і непаразуменне з боку бацькоў, прыходзіць у бядотны стан.

У «Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы» асабліва падкрэслена: «Толькі адзіная ў веры сям'я можа стаць дамашняй Царквой, у якой муж і жонка сумесна з дзецьмі ўзрастаюць у духоўнай дасканаласці і пазнанні Бога. Адсутнасць адзінамыслення стварае сур'ёзную пагрозу шлюбнаму саюзу» [7, 48].

Аптымальныя ўмовы выханання ствараюцца не там, дзе прыгожа напісаны план выхаваўчай дзейнасці з улікам усіх накірункаў, форм і метадаў, дзе своечасова праводзяцца патрэбныя інструктажы, гутаркі, дыспуты, тэматычныя мерапрыемствы, сустрэчы, канцэрты, дыскатэкі і многае іншае. Не там нават, дзе ствараюцца сайты з паказнымі матэрыяламі, дзе здымаюцца цэлыя фільмы пра лепшы вопыт выхавання (а робяць гэтую складаную працу і без таго загружаныя настаўнікі пад нажымам зверху, пакідаючы без належнай увагі дзяцей — асабістых дома і вучняў у школе). Сапраўдныя ўмовы для духоўна-маральнага, інтэлектуальнага і фізічнага ўзрастання ствараюцца там, дзе людзі проста жывуць — шчыра, адкрыта, радасна. Там, дзе на першым месцы Бог, дзе старасць у пашане, а маладосць у паслухмянасці, дзе пануе разважлівая жыццёвая мудрасць, паразуменне і любоў. Без паказных мерапрыемстваў, справаздач і выхвалення. Пра такія ўмовы цяпер можна толькі марыць…

Навошта мы штучна раздзяляем адукацыю і выхаванне на царкоўнае і свецкае? Выхаванне без Бога, веры і Царквы губляе асноўную сутнасць, асноўны сэнс. Яно можа быць шматбаковым, але бязлікім і штучным. Як «планавая» эканоміка адарваная ад патрэб рынку не можа трымацца доўга,

так і сістэма выхавання, дзе жывое і арганічнае ўзаемадзеянне замяняецца сцэнарыямі і павучэннямі, паказнымі тэатралізацыямі і конкурсамі, саперніцтвам у прыгажосці і лідарстве, вучобе і спорце. У выхаванні важна ўсё: і форма, і змест, а найважней — душэўная шчырасць. З адных і тых жа матэрыялаў можна пабудаваць храм і турму; у турме можна ўсталяваць царкву і прыгожы храм давесці да запусцення. Адказнасць перад Богам і людзьмі ляжыць на бацьках і настаўніках.

Самы бяспройгрышны варыянт выхавання — гэта асабісты станоўчы прыклад дарослых людзей ва ўсіх праявах жыццядзейнасці. Менавіта так выхоўвалі сваіх дзяцей нашы продкі. У арганічным суладдзі пакаленняў шліфаваліся сацыяльныя ролі чалавека на кожным этапе яго жыцця. Вось яны — асноўныя ролі, праз якія праходзілі мужчыны і жанчыны ў сям'і і соцыуме: Сацыяльныя ролі

| | |
|---|---|
| Мужчына | Жанчына |
| Сын | Дачка |
| Брат | Сястра |
| Жаніх | Нявеста |
| Муж | Жонка |
| Зяць | Нявестка |
| Бацька | Маці |
| Дзядуля | Бабуля |
| Гаспадар | Гаспадыня |

Пры гэтым нікому не прыходзіла ў галаву думка перайначыць, замяніць ці аб'яднаць поларалявыя або сацыяльныя статусы ў тых ці іншых жыццёвых абставінах. У кожнай сваёй сацыяльнай ролі чалавек жыў, маральна і духоўна ўдасканальваўся, узрушаны, навучаны і падтрыманы прыкладам старэйшых — бацькі і маці, дзядоў і бабуль, братоў і сясцёр, сваякоў і чужых людзей, якія жылі побач. У традыцыйнай беларускай сям'і «з ранняга маленства дзяцей прывучалі да малітвы, пастоў, да свядомага перанясення жыццёвых цяжкасцей як неабходнай умовы ачышчэння і выратавання душы» [8, 169].

Раней гаварылі: «Хужэй няма кары, як жыць без пары» [1, 119] — і стараліся своечасова ўступіць у шлюб, не плануючы пробных варыянтаў. Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, за апошнія гады (2016,2017) разводы ў адносінах да зарэгістраваных шлюбаў складаюць 50 % [5]. Пры гэтым не ўлічваецца колькасць скасаваных так званых «грамадзянскіх» шлюбаў, у якіх пражывае даволі значная частка маладых беларусаў. Прычына дэмаграфічнага крызісу ў тым, што мы адышлі ад традыцыйнага ўкладу жыцця. Як тут не ўзгадаць прароцтва: «Бо людзі будуць самалюбівыя, срэбралюбівыя, ганарлівыя, напышлівыя, злаcлоўныя, бацькам непакорныя, няўдзячныя, бязбожныя, недружалюбныя» [2-е Цімафею 3:2].

Калі гавораць пра здатнасць да шлюбу, то маюць на ўвазе такія якасці чалавека, як здольнасць клапаціцца пра іншых, самаахвярна служыць ім,

актыўна працаваць і рабіць дабро, умець спачуваць, супрацоўнічаць, быць цярплівым і велікадушным [2, 10]. Менавіта гэта і трэба выхоўваць у нашых дзецях.


1. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя / Уклад. і аўтар прадмовы А.С. Фядосік. — Мінск: Ураджай, 2002. — 298 с.
2. Духовно-нравственные основы подготовки учащихся к семейной жизни: сборник статей и материалов из опыта работы государственного учреждения образования «Вилейская гимназия № 2» / под общ. ред. Е.И. Зенько; ГУО «Мин. обл. ин-т развития образования». — Минск: Мин. обл. ИРО, 2013. — 106 с.
3. Маслов, Н.В. Духовные и нравственные основы образования и воспитания. Семья как субъект образования и воспитания / Н.В. Маслов. — 4-е изд., доп. — М.: Самшит-издат, 2017. — 504 с.
4. Маслов, Н.В. Толковый педагогический словарь: Духовные и нравственные понятия / Н.В. Маслов. — М: Самшит-издат, 2015. — 880 с.
5. Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Национальный статистический комитет Республики Беларусь.— Минск, 2018.— Режим доступа:http://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/demografiya_2/g/ braki-razvody-i-obschie-koeffitsienty-brachnosti-i-razvodimosti. — Дата доступа: 20.12.2018.
6. Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста / Пераклад з грэчаскай на сучасную беларускую мову Біблейскай камісіі Беларускай Праваслаўнай Царквы; адказны рэдактар перакладу протаіерэй Сергій Гардун. — Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора: Медыял, 2017. — 544 с.
7. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви / Юбилейный архиерейский собор Русской Православной Церкви. — М., 2000. — 88 с.
8. Традиции православной духовности в нравственном воспитании и предупреждении семейного неблагополучия: сборник докладов X Свято-Евфросиниевских педагогических чтений. — Минск: Пачатковая школа, 2008. — 200 с.
9. Энциклопедия православной семьи / Авт.-сост. В. Зоберн. — М.: ОЛМА Медиа Групп, 2014. — 304 с.



***Каврига Дмитрий***

*иерей, лиценциат канонического права, преподаватель Минской духовной академии*


## «De bonis Ecclesiae temporalibus» (can.1254) в свете социальной доктрины Римско-католической Церкви

Социальное учение католической церкви представляет собой сборник текстов, носящих доктринальный характер, где речь идет о проблемах социальной справедливости, включая бедность и богатство, вопросы экономики, социальной организации и роль государства в данной сфере.

Традиционно считается, что его основания были заложены папой Львом XIII в его знаменитой энциклике «Rerum Novarum» (1891), в которой содержатся принципы экономической составляющей в жизни и деятельности Церкви, осуждались капитализм и социализм, хотя своими корнями само это учение уходит в работы таких известных авторов, как Фома Аквинский и Аврелий Августин. Оно также восходит к концепциям, присутствующим в Священном Писании и даже является элементом культуры Древнего Ближнего Востока.